

# Круглы стол

# «Краявіды маёй вёскі»





# “Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся”

**Дзівосны наш край – наша маленькая радзіма, дзе мы нарадзіліся, жывём і працуем.**



Наша маленькая Радзіма – гэта вёска Баравое, Лельчыцкага раёна, Гомельскай вобласці.

**Дубы наўкол гамоняць**
**Рэчка Убарць сінізну нясе**
**На світанні ходзяць ціха коні**
**Кінуўшы адбітак на расе**





# Наша прырода

**Ва ўрачыстай цішыні песцяцца нагрэтыя сонцам бары, у дубравах не зварухнуцца магутныя дубы-асілкі, цвіце на ўзлесках пахучы чабор**





# А якія людзі ў нас жывуць!

**Працавітыя і добрыя!**

**Сумленныя і сціплыя!**

**Адказныя і**





**А зараз мы з вамі адправімся ў далёкае мінулае, каб даведацца, адкуль пайшла назва нашай вёскі.**

**Не кліч, не кліч –**
**Мне ўдалеч добра крочыцца,**
**Аддамся я шляхам, вытокам, недрам**
**Бо мне ў душу стагоддзяў глянуць хочацца**
**Нібы ў акно, расчыненае ветрам.**



# А пачыналася ўсё каля 500 гадоў назад





# Назва вёскі

Вёска Баравое размешчана на рацэ Убарць. Назву сваю яна бярэ ад слова “бор” – значыць сасновы лес. Даўным даўно на гэтым месцы рос вялікі сасновы лес.





# Калі ўзнікла вёска?

**Час заснавання нашага населенага пункта да цяперашняга часу застаецца невядомым.**

**Вёска Баравая, цяпер Баравое, у летапісах упершыню ўпамінацца *<u>3 студзеня 1763 года.</u>***





# У 1885 годзе на тэрыторыі вёскі працавала мельніца, дзейнічала хлебазапасная крама.

У 1886 годзе - у вёсцы 108 двароў, 742 жыхары, а ў 1910 годзе існавала народнае вучылішча, якое пасля стала называцца школай 1-ай ступені.

Школа размяшчалася ў наёмнай сялянскай хаце. У ёй навучаліся 39 вучняў (з іх 8 дзяўчынак).





# Гістарычныя помнікі

**У самым цэнтры вёскі знаходзіцца царква. Першапачаткова тут былі могілкі, на якіх стаяла часоўня. А ў 1865 годзе пабудавана царква, па форме падобная на прамавугольнік.**

**Яна была асвечана ў імя Святой Троіцы.**




2009/12/06 16:10



# Каменная Баба

Калісьці, даўным-даўно на месцы вялікага сасновага лесу было поле. На гэтым полі жанчына з дачкой жыта жалі.

Дачка лянавалася, не хацела жаць. У гэты час хмара стала надыходзіць. Маці стараецца з усіх сіл, а дачка трошкі пажне і стаіць.

Маці пачала на яе крычаць: “А чаго ж ты стаіш, каб ты каменем стала”. Гром ударыў і дачка ў камень пераўтварылася.





# Ваенныя гады

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.



## Вялікая Айчынная вайна прынесла шмат бед, пакут і слёз многім людзям. Не абышло гэта ліхалецце і нашу вёску.

**Перад пачаткам вялікай Айчыннай вайны Баравое налічвала 252 двары, 1256 жыхароў.**

**У верасні 1943 года нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і забілі 33 жыхары.**

# У час вайны загінулі 129 воінаў, нашых аднасяльчан



# На мясцовых могілках у брацкай магіле захаронены 3 салдаты і 4 партызаны





# Сучасная вёска

На сёняшні дзень Баравое – вёска, цэнтр Бараўскога сельсавета і мае статут аграгарадка

Геаграфічнае становішча вёскі: яна размешчана ў 24 кіламетрах на паўднёвы захад ад Лельчыц, 239 кіламетраў ад Гомеля.




РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
БАРАЎСКІ СЕЛЬСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
САВЕТ ДЭПУТАТАЎ
БОРОВСКОЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
СОВЕТ ДЕПУТАТОВ



З кожным годам вёска расце, будуецца і прыгажэе. На яе тэрыторыі размешчаны: лясніцтва Мілашавіцкага лясгаса, участак Ельскага леспрамгаса, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, фельдшарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, 4 крамы.



# Так выглядае сучасная вуліца





# Гульня “Словы”.

**Вядучы называе слова, сказ або словазлучэнне, а вы ўспамінаеце, што яно азначае.**

- 1)Каменная Баба -….
- 2) Царква - …
- 3) Убарць - …
- 4) Літоша - …
- 5) Помнік - …





# Мы любім сваю вёску, маленькі куточак прыгожай беларускай зямлі.

**Мая Айчына – поле, нівы.**
**Над Нёманам зялёны гай.**
**Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы –**
**Уся Беларусь ад краю ў край**

